# Толькі разам

**Беларускі дзіцячы фонд — адна з грамадскіх арганізацый, якая падтрымлівае мнагадзетныя і замяшчальныя сем'і, сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, — сустрэў сваё, можна сказаць, прафесійнае свята разам з дзецьмі. Сёлета, як і раней, пачынаючы з 1988 года, прайшла рэспубліканская акцыя фонду "Падорым дзецям свята!". У кожным раёне краіны яна праходзіць па-свойму — гэта марафоны, канцэрты, выставы і г.д.**

Так, у панядзелак у Доме Масквы ў сталіцы Беларускі дзіцячы фонд арганізаваў свята для 250 дзяцей-сірот і дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, большасць з якіх сёлета прыехала ў Мінск з Магілёўшчыны. Усе малыя сталі ўдзельнікамі гульняў, якія для іх падрыхтавалі аніматары адпаведных цэнтраў і кампаній, а таксама студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У гэты ж дзень ганаровыя прэміі фонду імя З.Туснолобавай-Марчанка атрымалі лепшыя мнагадзетныя сем'і Беларусі, якія выхоўваюць пяцярых і больш дзяцей. А прэміі "Сябар дзяцей" уручылі дарослым, якія шмат гадоў дапамагаюць дзецям. Некалькі таленавітых дзяцей-сірот і інвалідаў атрымалі міжнародную стыпендыю "Мы верым у цябе!".

Для малых, якія прыехалі на свята ў Мінск, выступілі вядомыя беларускія артысты, а таксама пераможцы рэспубліканскага конкурсу "Музыка дзіцячай душы". Яшчэ ў праграме свята быў баль выпускнікоў для 14 дзяцей-сірот з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Для іх вядомыя беларускія дызайнеры і стылісты падрыхтавалі падарункі. Былі на свяце і іншыя падарункі і сюрпрызы, напрыклад, фотавыстава "4383 дні дзяцінства".

— Акрамя таго, Беларускі дзіцячы фонд пачынае новы праект "Першая афіша", у рамках якога пасадзейнічае арганізацыі персанальнай выставы, канцэрта, прэзентацыі кнігі і г.д., — расказала прадстаўнік Беларускага дзіцячага фонду Юлія Капцэвіч. — Сёлета пры падтрымцы Музея гісторыі Мінска мы адкрылі "Першую афішу" персанальнай мастацкай выставай "Мой свет, мая мара" Кацярыны Віткоўскай з дзіцячага дома сямейнага тыпу з Бабруйска.

**Марына ХІДДЖАЗ.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ